# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 10 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.**

[план’э́та жыв’э́ дл’ал’удз’э́й. ін’ікóл’і н’азгáс’н’э, н’азг’і́н’э]

*За кожнае правільна затранскрыбіраванае фанетычнае слова – 1 бал.*

*Заўвага:* Гукі могуць перадавацца на пісьме рознымі літарамі або спалучэннямі літар: гук ***й*** можа – ***й, j***; падоўжаныя зычныя – дзвюма літарамі або літарай з рыскай зверху ***[ с̄]***; фрыкатыўны гук ***г*** – літарай ***г*** або лацінскай літарай ***ɣ***; афрыкаты ***дз, дз’, дж*** – спалучэннем ***д, з, ж*** і інш.

**Заданне 2.**

| Слова | Магчымае тлумачэнне | Магчымыя адпаведнікі |
|---|---|---|
| **Аватарка** | графічная выява, якая прэзентуе карыстальніка ў Інтэрнэце | самапрадстава, самапрадстаўлянка і пад. |
| **QR-код** | штрыхкод, што змяшчае інфармацыю, якая “счытваецца” камерай смартфона або спецыяльным сканерам; карцінка, у якой зашыфравана тэкставая інфармацыя | чытай-карцінка, счыт-малюнак, зліч-малюнак і пад. |
| **Хэштэг** | ключавая фраза, метка ў сацыяльных сетках, блогах, YouTube і Telegram-каналах, якая складаецца з сімвала # і ключавога слова ці словазлучэння | ключ-пазнака, рашоткавая памета і пад. |

*За кожнае правільнае тлумачэнне значэння – 1 бал, за максімальна дакладны адпаведнік – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *дарожка* | ‘уступаць у непрымірымыя супярэчнасці з кім-н., узаемна варагаваць’ | ***сустракацца на вузкай дарожцы*** |
| *дзверы* | ‘настойліва сцвярджаць, даказваць тое, што даўно ўсім вядома і не выклікае пярэчанняў’ | ***ламацца ў адчыненыя дзверы*** |
| *дом* | ‘рэдка бываць дома, не цікавіцца дамашнімі справамі’ | ***адбівацца ад дому*** |
| *палец* | ‘гаварыць, сцвярджаць што-н. без належных падстаў; выдумваць’ | ***высмоктваць з пальца*** |
| *рука* | ‘нажывацца несумленным спосабам’ | ***грэць рукі*** |
| *ход* | ‘адступаць ад раней сказанага, зробленага, адмаўляцца ад ранейшага намеру, рашэння’ | ***даваць задні ход*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *хадзіць* | ***хадок*** | *апавяданне* | – |
| *жарт* | – | *паўстанне* | ***паўстанец*** |
| *востраў* | ***астравіцянін*** | *Балівія* | ***балівіец*** |
| *раман* | ***раманіст*** | *пілатаваць* | – |
| *пагоня* | – | *барацьба* | ***барацьбіт*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал. За лішняе слова адымаецца 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ***Назоўнік з канчаткам -ы:***<br>журы, араты, куцы, заўзяты | араты |
| 2 | ***Прыметнік, які мае адну прыстаўку:***<br>абясшкоджаны, незвычайны, безвыніковы, безуцешны | безвыніковы |
| 3 | ***Займеннік, які мае два канчаткі:***<br>хто-небудзь, абы-які, сёе-тое, камусьці | сёе-тое |
| 4 | ***Лічэбнік, які не змяняецца па родах:***<br>два, пяцідзясяты, тысяча, паўтара | тысяча (мае род) |
| 5 | ***Дзеяслоў, у якім канчатак 1-й асобы адзіночнага ліку складаецца з аднаго зычнага гука:***<br>карміць, адчуваць, перадаць, наядацца | перадаць (перада-м) |
| 6 | ***Дзеепрыслоўе, утворанае ад дзеяслова II спражэння:***<br>пад’еўшы, крычучы, абрэзаўшы, высекшы | крычучы |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| **№ сказа** | **Прыкладнае тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Прыкладны варыянт выпраўленага сказа** |
|---|---|---|
| **1** | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа. Злучнік ***не толькі…, але і*** звязвае аднародныя члены сказа. Значыць першая частка злучніка (***не толькі…***) павінна стаяць перад першым аднародным членам сказа, а другая частка (***але і…***) – перад другім | Сымон Будны заклікаў усіх грамадзян ***не толькі*** паважаць дзяржаўныя законы, ***але і*** шанаваць бацькоўскую зямлю і матчыну мову, сумленна выконваць свае абавязкі. |
| **2** | Памылка звязана з паўторам ў блізкім кантэксце аднакаранёвых слоў: ***Напісаны ад рукі рукапісны***. Таўталогія | ***Напісаны ад рукі*** часопіс брыгады “Полымя” Мінскай вобласці нагадвае аб’ёмную кнігу з вялікай колькасцю ілюстрацый.<br>АБО<br>***Рукапісны*** часопіс брыгады “Полымя” Мінскай вобласці нагадвае аб’ёмную кнігу з вялікай колькасцю ілюстрацый. |

| | | |
|---|---|---|
| **3** | Няма памылкі | – |
| **4** | Памылка звязана з ужываннем ступені параўнання прыметніка. Пры адсутнасці параўнання, а таксама ў тым выпадку, калі яно не падразумяваецца, трэба выкарыстоўваць найвышэйшую ступень параўнання прыметнікаў (простую або складаную форму) | Археалагічныя раскопкі дазваляюць сцвярджаць, што на момант узвядзення Сафійскага сабора Полацк быў адным з ***найбуйнейшых (самых буйных)*** гарадоў ва Усходняй Еўропе. |
| **5** | Памылка звязана з выкарыстаннем у якасці аднародных адначасова адасобленага азначэння, выражанага дзеепрыметнікавым зваротам, і даданай азначальнай часткі складанага сказа.<br>АБО:<br>Памылка звязана з афармленнем даданай азначальнай часткі ў складаназалежным сказе. Даданая азначальная частка ставіцца, як правіла, пасля назоўніка, да якога адносіцца | Дажынкамі называлі таксама і старажытнае народнае свята, ***якое існавала на беларускіх землях з даўніх часоў і звязана з заканчэннем жніва***. |
| **6** | Памылка звязана з каардынацыяй дзейніка і выказніка: пры дзейніку ***цэнтр*** выказнік павінен мець форму мужчынскага роду. У спалучэнні ***цэнтр “Зубраня”*** назва цэнтра з’яўляецца прыдаткам | Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы ***цэнтр*** “Зубраня” ***стаў*** сапраўдным сімвалам дзіцячай дыпламатыі, моцнага сяброўства. |

*За кожны правільна запоўнены радок (у тым ліку за ўказанне на адсутнасць памылкі) – 1 бал (0,5 бала за выяўленне і 0,5 бала за тлумачэнне памылкі).*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Накінулася зіма на жывёл *(звяроў)*. Зацерушыла *(запарушыла)* снегам палі, заваліла гурбамі *(сумётамі)* лясы, апранула дрэвы ледзяной карой і пасылае мароз за марозам. Ідуць маразы адзін за другога злейшыя, з елкі на елку пераскокваюць, патрэскваюць ды пашчоўкваюць, звяроў палохаюць. Не спалохаліся звяры: у адных футры цёплыя, іншыя ў глыбокія норы схаваліся *(пахаваліся)*; вавёрка ў дупле арэшкі грызе; зайка *(зайчык)*, скачучы, грэецца, а konікі, кароўкі, авечкі даўным-даўно ў цёплых хлявах гатовае сена жуюць, цёплае пойла п’юць.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Абазначэнне тэрміна | Тэрмін | Тэрмін можна выкарыстаць пры характарыстыцы |
|---|---|---|
| **А** | Лірыка | + |
| **Б** | Эпас | |
| **В** | Жыціе | |
| **Г** | Трыялет | |
| **Д** | Тэма | + |
| **Е** | Эпілог | |
| **Ж** | Эпітэт | + |
| **З** | Ямб | + |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| | | |
|---|---|---|
| **А** | 2 | Уладзімір Караткевіч |
| **Б** | 3 | Якуб Колас |
| **В** | 5 | Аркадзь Куляшоў |
| **Г** | 6 | Францішак Багушэвіч |
| **Д** | 7 | Змітрок Бядуля |
| **Е** | 1 | Максім Гарэцкі |

*За кожнае правільнае суаднясенне – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне аўтара – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка задання складаецца з трох кампанентаў: ацэнкі фактычных ведаў пра аўтара, назву твора і імя галоўнага героя, ацэнкі паўнаты апісання эпізоду, ацэнкі якасці прапанаваных парад.*

*Фактычныя веды пра аўтара, назву твора і імя галоўнага героя*

| Параметр | Адказ | Колькасць балаў |
|---|---|---|
| **Аўтар** | Уладзімір Караткевіч | 0,5 |
| **Назва твора** | “Дзікае паляванне караля Стаха” | 0,5 |
| **Імя фалькларыста** | Андрэй Беларэцкі | 1 |

*Паўната апісання эпізоду*

| Крытэрый | Колькасць балаў |
|---|---|
| Эпізод апісаны дастаткова поўна, адсутнічаюць фактычныя памылкі | 1 |
| Эпізод апісаны дастаткова поўна, ёсць 1-2 фактычныя памылкі<br>АБО<br>Эпізод апісаны не зусім поўна (адсутнічаюць некаторыя дэталі, указаныя ў заданні), адсутнічаюць фактычныя памылкі | 0,5 |

| | |
|---|---|
| Эпізод апісаны няпоўна (адсутнічаюць усе дэталі, указаныя ў заданні)<br>АБО<br>Маецца больш за 2 фактычныя памылкі<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 |

*Якасць прапанаваных парад:*

| Крытэрый | Колькасць балаў |
|---|---|
| Прапанаваны тры парады, якія адпавядаюць тэксту і ўмовам задання | 3 |
| Прапанаваны дзве парады, якія адпавядаюць тэксту і ўмовам задання<br>АБО<br>Прапанаваны тры парады, але выкананы толькі дзве ўмовы задання для парад | 2 |
| Прапанавана адна парада, якая адпавядае тэксту і ўмове задання<br>АБО<br>Прапанаваны тры ці дзве парады, але выкананы толькі адна ўмова задання для парад | 1 |
| Усе прапанаваныя парады не адпавядаюць тэксту ці ўмовам задання<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 |